## ТАНКІ ПА ПЛЯЖЫ НЯ ХОДЗЯЦЬ?

Такой паўжартоўнаю фразаю, браце, толькі са сьцьвярджальнай інтанацыяй, адказваў я на пытаньні знаёмых, ці не баюся ехаць адпачываць на поўдзень. Як картвэлёляг я ведаў, што грузінска-абхаскія супярэчнасьці насьпявалі здаўна, але так ці інакш крывавых сутыкненьняў раней удавалася ўнікаць. Сёлета абхаскі парлямэнт абвясьціў былую аўтаномную рэспубліку сувэрэннай дзяржаваю. Але і гэта не паўплывала на рашэньне паехаць на пачатку жніўня зь сям’ёю ў літфондаўскі дом творчасьці пісьменьнікаў, што ў Піцундзе.

Падаю тут табе свае суб’ектыўныя нататкі і ўрыўкі зь дзёньнікавых запісаў другой паловы жнівеньскага "адпачынку" ў Абхазіі. Па зразумелых прычынах выбраў найперш тыя, што датычаць Беларусі, а таксама падзеі, якія не маглі не хваляваць мяне ні як чалавека, ні як картвэлёляга.

9 жніўня 1992 г. Ідзе тут барацьба за ўладу. Покуль Гугушы Тарасавіч Багатурыя быў у Маскве, абхазы ўзламалі дзьверы кабінэту, пасадзілі свайго дырэктара, якога, праўда, аднаго разу ўжо выводзілі адтуль аўтаматчыкі. Аднак Сухумі хоча бачыць свайго, незалежнага дырэктара, а той будзе фармаваць адпаведную "каманду" і ўжо выжыў некалькі славянаў з пэрсаналу, паціху бярэцца за грузінаў (а працу ў Піцундзе знайсьці амаль немагчыма). А Масква падтрымлівае старога, грузіна, пагражае перапыніць фінансаваньне, безь якога, далікатна кажучы, нялёгка будзе Даўлету

Канстанцінавічу Пілії ўтрымліваць Дом творчасьці, нягледзячы на немалыя кошты пуцёвак...

11.08.92 г. Куплялі ажыны ў старой, гадоў пад восемдзесят, бабулі. А яна кажа: "Ягада сьпелая, дык патроцца..." Пытаемся: "Бабка, ці не зь Беларусі будзеце?" — "Ага, дзеткі, з Гомельскай вобласьці." Расказала яна, што Піцунду будавалі пераважна славяне, што прыехалі сюды пасьля вайны, утварылі саўгас. Пачалі з асушэньня суцэльных балотаў, а так зямля тут урадлівая. Цяпла і спорных дажджоў хапала. Хамсы, бывала, прыбівала столькі, што насілі й салілі вёдрамі, толькі не лянуйся. Старэйшая сястра слала на разбураную вайною Гомельшчыну пасылкі з крупамі і рыбаю, а ў канцы пяцідзясятых угаварыла, перацягнула туды і яе разам з сынам, які адслужыў тэрміновую...

13.08.92 г. ...Хадзіў з Максімам Клімковічам кілямэтры за чатыры ў вёску Лідзава за возерам Інкіт. Адлегласьць амаль такая самая як да пуцундзкага базару. Не адразу патрапілі, але ў двух грузінскіх дварах прадалі нам ружовага віна, прычым па цэнах разы ў паўтара ніжэйшых за базарныя, а ў старой армянкі купілі буйных і салодкіх сакаўных ігруш, лімонаў, проста з дрэва рвалі гібрыд пэрсіка са сьліваю. Адчувалася, праўда, насьцярожанасьць да нас, нават калі загаворваў да вяскоўцаў па-грузінску...

14.08.92 г. У небе трывожна. Шнуруюць самалёты, а ніжэй кружаць, проста прасуюць перадгор'і грузінскія верталёты. Пагаворваюць пра ваенныя акцыі пад Сухумі, за восемдзесят кілямэтраў ад нас. Грузіны нібыта падвялі туды сваю нацыянальную гвардыю — мхэдрыёні, а абхазы быццам бы абвясьцілі мабілізацыю мужчын да 40 гадоў. Пасёлак Піцунда нагадвае разварушаны мурашнік. Асабліва шматлюдна каля манастыру і будынку пасялковага савету.

15.08.92 г. Адам Глёбус, мабыць, ня можа прыляцець — бастуюць расейскія авіядыспэчары, патрабуючы 60-тысячнай (!) зарплаты. Кажуць, што ўчора Адлер не прыняў аніводнага самалёту. Спадзяюся, што Глёбус глядзіць тэлевізар і ня возьме пад увагу маю тэлеграму тыднёвай даўніны з тэкстам: "У Багдадзе ўсё спакойна". Некаторыя тут ужо нэрвуюцца, пагаворваюць пра ад’езд...

16.08.92 г. Нязвыкла бачыць БМП на вуліцах курортнага пасёлку, кулямётчыкаў, аперазаных стужкамі з патронамі буйнога калібру. Пазачыненыя ўсе летнія кавярні, крамы і кіёскі, базар як вымер. Па шашы разьяжджаюць патрульныя легкавікі з дэманстратыўна выстаўленымі ў вокны рулямі аўтаматаў. Пяцёрка такіх патрульных зайшла са зброяй у адзіны адчынены рэстаран, дык усе наведнікі адзін за адным пасыходзілі. Мы вярталіся ў Дом творчасьці берагам мора, хоць гэта значна далей, як па шашы. Яшчэ колькі дзён гэткай напружанасьці — і не ўяўляю, хто прыедзе сюды наступным летам!..

17.08.92 г. Сапсавалася надвор’е — раніцою была сапраўдная залева. Можа, яна згасіла абхаска-грузінскі канфлікт? Ноччу з боку Гагры, а гэта за нейкія дваццаць кілямэтраў, былі чуваць толькі рэдкія бязладныя стрэлы. Але настрой па-ранейшаму трывожны: зноў назаляюць самалёты і верталёты...

Максім зь Мірыкам Адамчыкам прачыталі напісаную тут дэтэктыўную тэлеп’есу "Прывід у Гайцюнішках". Хлопцы зьбіраюцца дахаты і гэта засмучае, дае знак, што і мне хутка належыць патурбавацца пра ад’езд. Пагаворваюць, што і грузіны, і абхазы могуць узарваць мост праз рэчку Бзып...

18.08.92 г. Каля шаснаццаці гадзін прагучала слова "эвакуацыя", але адміністрацыя ўсіх заспакойвае, кажа, што такі варыянт ня выключаны, але

покуль што на тое няма падставаў. Паабяцалі нам, што да Адлера будуць вазіць аўтобусамі Дому творчасьці.

19.08.92 г. — 15.15. Раніцой правялі Максіма зь Мірыкам, і цяпер яны, мусіць, у Менскім аэрапорце.

Бегаем да тэлевізару глядзець навіны. Расейцы сьвяткуюць у Маскве гадавіну перамогі над путчыстамі. Па-рознаму можна ставіцца да яе, але перамога тая паспрыяла ўсталяваньню сувэрэнітэту Беларусі. А ў нас тут свае "салюты". Паказваюць перастрэлкі ў Сухумі, кажуць пра марадзёраў, а таксама пра горцаў, гатовых ваяваць у Абхазіі.

20.08.92 г. Літфондаўскі аўтобус спраўна возіць раніцою ў аэрапорт. Аднак некаторыя палічылі за лепшае зьехаць адсюль раней тэрміну.

21.08.92 г. Грузіны, што жывуць у Абхазіі і на Паўночным Каўказе, абвешчаныя закладнікамі горскіх народаў. Абхаскія заставы не выпускаюць, вяртаюць іх. Звыклым у постсавецкім лексыконе стала слова "бежанец", а цяпер да яго дадаецца яшчэ адно, ня менш страшнае — "закладнік".

22.08.92 г. Разьвіваецца тэма закладнікаў. У санаторы "Амра" нібыта прымусова ўтрымліваюць каля 300 грузінаў. Праўда гэта ці плёткі? Многія ў нас перабраліся зь дзіцячага ў высотны корпус, калі пачулі, што па суседзтву, у пансіянаце "Правда" ўзброеныя марадзёры вынесьлі проста з холу каляровы тэлевізар. Гэта аказалася перабольшаньнем. Затое праўда тое, што абвешчана камэнданцкі час: з 23.00 да 6 гадзін раніцы. Купацца ходзім як па інэрцыі, без ранейшага імпэту. Сёньня ў сталоўцы зьявіліся навічкі, бацька зь дзесяцігадовым сынам. Дык на іх пазіралі як на вар’ятаў.

23.08.92 г., нядзеля. Балюча пісаць пра тое, што здарылася на пляжы. Юля зь Юрам, якія прыехалі з-пад Архангельску, сядзелі на паласе прыбою, а іхні чатырохгадовы Раман адышоўся да бамбуку і ўскараскаўся на тэнты.

Немаведама адкуль наляцелі, пачалі джгаць яго восы. Малы перапалохаўся, нема закрычаў ад болю, пачаў адбівацца ад іх, а таму не ўтрымаўся і, страціўшы раўнавагу, абрынуўся ўніз. Але ня ўпаў долу, на мяккі пясок, а зачапіўся рукою вышэй локця за навараныя да мэталічнага слупа крукі для адзеньня, павіснуў на іх... Рая аказалася бліжэй за іншых, зьняла акрываўленага Рамана і кінулася зь ім да бацькоў. Уяўляю, што перажылі яны, бо калі праз паўгадзіны я ўбачыў сваю Раю, дык яна была ўсё яшчэ спалатнелая... Разгубілася і мэдсястра, ніяк не магла патрапіць зрабіць укол, каб зьняць у малога боль. Так і павёз яго бацька ў бальніцу. Дакладней, павёз іх адзін з адпачыньнікаў, тбіліскі армянін. Павёз не куды-небудзь, а ў Гагру, дзе разрываліся ігольчатыя снарады, павёз на сваіх "Жыгулях", якія з тыдзень таму абакралі ўначы, хоць і стаяла машына на асьветленай аўтапляцоўцы. Адметны гэты армянін і тым, што паўсюдна, нават у сталоўку і ў кабінэт да дырэктара, ходзіць без кашулі, хоць торс ягоны не назавеш шварцэнэгераўскім. Прывёз ён сюды двух хлопчыкаў-блізнят і трохмэтровага пітона, зь якім пару разоў зьяўляўся на пляжы, распалохваючы купальшчыкаў...

Па першай праграме тэлебачаньня праскочыла паведамленьне, што ўсе курортнікі з Гагры і зь Піцунды вывезеныя. Няўцямна паціскаем плячыма — "А мы хто, "мёртвыя душы"?"

<u>24.08.92 г.</u> Не дайшоў да Адлера, вярнуўся з-за перастрэлкі на дарозе наш аўтобус. Гэта ўжо больш чым сур’ёзны званок. Усё цяжэй прымусіць сябе садзіцца працаваць ад сьняданку і да абеду. Якая тут проза, калі ня ведаеш, як вывезьці сям’ю, якім чуткам верыць, а якім — не.

Адзін з камандзіраў мхэдрыёні, палкоўнік Каркарашвілі, заявіў празь мясцовае тэлебачаньне, што гвардзейцы ня будуць браць палонных, што загіне

кожны, хто сустрэне іх са зброяй у руках, незалежна ад нацыянальнай прыналежнасьці. А яшчэ ён сказаў, што гатовы пакласьці сто тысяч грузінаў, але вынішчыць дзевяноста сем тысяч (а гэта значыць усіх!) абхазаў! Што ж тады называць генацыдам?!

25.08.92 г. Зноў прагучала слова "эвакуацыя". Гэтым разам — сур'ёзна. Вывозіць, найверагодней, будуць па паветры або морам з дапамогаю міжнароднага Чырвонага Крыжу. Нават ня верыцца, што пры такім сонцы, паветры і моры хтосьці намерваецца праліваць кроў.

Часам складаецца ўражаньне, што сцэнар падзеяў узгоднены ў Маскве і ў Тбілісі (вялікая імпэрыя салідарная зь меншай?). Бачыцца правакацыйнай роля як расейскага тэлебачаньня, так і тэлекампаніі "Астанкіна" — нярэдка яны як бы апярэджваюць сваімі паведамленьнямі дзеяньні Дзяржсавету Грузіі, разьвязваюць рукі Шаварнадзэ. Старажытныя рымляне ў падобных выпадках пыталіся "Cui bono? — Каму гэта на карысць? Хто ад гэтага выйграе?" Відавочна, што нагнятаньне атмасфэры (пагрозы, ультыматумы, патрабаваньне адстаўкі Уладзіслава Ардзінбы) выгодныя найперш Шаварнадзэ. Ён ужо мае з канфлікту пэўны плён — абвясьціў абстаноўку ў рэспубліцы складанай і перанёс прэзыдэнцкія выбары на няпэўны тэрмін, захаваўшы за сабою ўладу. Здаецца, што расейцы маральна, зброяй і нават людзьмі (горцы — грамадзяне Расейскай Фэдэрацыі!) падтрымліваюць, разьдзімаюць канфлікт. Яны, выцесьненыя з Іраку і Аўганістану, зацікаўленыя, каб апасродкавана супрацьстаяць мусульманскаму сьвету.

26.08.92 г. Учора ўвечары выпілі каньяку "Эніселі" за ад'езд. На бальконе, пры сьвечцы (сьвятло згасла — сьветламаскіроўка?), пад акампанямэнт аўтаматнай страляніны на недалёкім кукурузным полі.

Не прыйшлі прыбірацца пакаёўкі, мужы не пусьцілі працаваць у сталоўку дзьвюх афіцыянтак зь недалёкіх паселішчаў. Хлеб, пераважна лавашы-праснакі пякуць ноччу ў нас у сталоўцы, бо піцундзкая хлебапякарня стала — няма мукі. Сабралі нас толькі а палове адзінаццатай, каб сказаць, што карабель "Енисей" мусіць быць у Піцундзе толькі заўтра каля а восьмай гадзіне. Запэўніваньні дырэктара, 40-гадовага маладзёна, што ўсё ідзе някепска, і наша бясьпека гарантуецца, гучыць проста інфантыльна. Між тым усё мацней чуваць артылерыйска-мінамётную кананаду. Але нам кажуць, што калі баі зьмесьцяцца сюды, можна пайсьці ў сховішча. Маскоўскі літапаратчык Мікалай Пліско бачыў яго — сутарэньне са старымі трубамі, без вэнтыляцыі і з адзіным выхадам. Ягоная жонка, якая перажыла ў свой час віленскія студзеньскія падзеі, дазванілася да мэра Сочы, а той кажа, што нічога ня можа зрабіць. Ідуць тэлефонныя перамовы Ельцына з Шаварнадзэ, і апошні сьцьвярджае, што небясьпека адпачыньнікам не пагражае, што ня трэба ўмешвацца, прысылаючы якія б там ні было караблі. ....! Першы імітуе актыўную дзейнасьць, а напраўду паўтараюцца сцэнары прыднястроўскага і паўднёва-асяцінскага канфліктаў! А хто другі? Узурпатар улады, прапісаны, дарэчы, у Маскве. Цяпер гэты былы першы сакратар рэспубліканскай кампартыі зноў парушае закон, каб застацца ў кіраўнічым крэсьле. Амэрыканскі прэзыдэнт вунь спыніў сваю перадвыбарчую кампанію і вылецеў у раёны, што пацярпелі ад урагану "Эндру". Той жа Буш не спыняецца ні перад чым, каб абараніць жыцьцё і гонар сваіх суграмадзянаў. А ў нас чалавечае жыцьцё даўно абясцэненае. Праўда, вельмі ўсьцешыліся мы, калі пачулі, што беларускае МЗС даслала ноту МЗС Грузіі ў сувязі з тым, што ў зоне вайсковых дзеяньняў знаходзяцца сотні грамадзянаў Беларусі, запатрабавала зрабіць усё магчымае, каб эвакуяваць іх. Аднак грузіны ня

толькі не вывозяць людзей, але і пагражаюць абстрэльваць чужыя караблі. Ім, як і абхазам, відаць, выгадна разыгрываць карту з чужымі грамадзянамі, прыкрывацца імі як жывым шчытом. А людзей гэтых у адной толькі Піцундзе каля 1600!

Турбуе і тое, што ня маем ні сувязі з домам, дзе за нас хвалююцца, ні надзейнай інфармацыі. Тэлебачаньне перадае зьвесткі недакладныя, смакуе праблемы варожых бакоў. А дыктарскія камэнтары! Як далёка ім да аб’ектыўнасьці ангельскай "BBC"!

Ад самалёту ў Адлеры аддзяляе нас нейкая сотня прыбярэжных кілямэтраў і дзевятнаццаць гадзін часу. На жаль, мала верыцца, што патрапім мы на той самалёт...

Тут, браце, мае дзёньнікавыя запісы абрываюцца, бо наступныя дні былі настолькі спрасаваныя, што ня меў часу або фізычнай магчымасьці сесьці з нататнікам і ручкаю. Таму аднаўляю іх па памяці сёньня, 2-га верасьня.

Увечары 26-га даведаліся выпадкова, што адпачыньнікі з "Правды" ўтварылі свой камітэт эвакуацыі. Ягоныя сустаршыні пабывалі ў бліжэйшай вайсковай частцы, дамовіліся, што і цывільных з бліжэйшых пансіянатаў эвакуюють уначы разам з вайскоўцамі. Пабеглі да Саіда, намесьніка нашага дырэктара. Той кудысьці пазваніў, пагаварыў па-абхаску і заявіў, што аніякага вайскова-транспартнага карабля ня будзе. Але мы ўжо не далі веры, зноў пайшлі ў "Правду" — шукаць праўды. Аднак на рагу каля бару мяне і Янку Сіпакова спынілі грубым воклічам "Стоять!" Пачуўся ляскат затвораў, і трое ў камуфляжнай форме з аўтаматамі напагатове рушылі нам насустрач. У такой сытуацыі лепей не пярэчыць (па сабе ведаю — калі трымаеш зараджаную зброю, пачуваесься дзікуном, уладарным і агрэсіўным). Нам загадалі

kamunikat.org

пакласьці рукі за голаў, праканваявалі да старэйшага — Ібрагіма. Той правёў нас далей і толькі на ганку дазволіў апусьціць рукі. На шчасьце, у мяне з сабою аказалася курортная картка, пазналі нас і тамтэйшыя адміністратаркі. Пад спачувальнымі і насьцярожанымі позіркамі "праўдзістаў" патлумачылі мы, чаму парушылі камэнданцкую гадзіну. Не адразу, але дапамаглі нам адшукаць аднаго з сустаршыняў эвакуацыйнага камітэту, маскоўскага камэрсанта Валянціна Бірукова. Той пагадзіўся ўнесьці Сіпакова і маю сям’ю ў сьпісы, пад строгім сакрэтам пацьвердзіў зьвесткі пра транспарт, які можа зьявіцца і празь некалькі хвілін, і празь некалькі гадзін...

Літаральна праз паўгадзіны мы са спакаванымі чамаданамі і з паўсоннымі дзецьмі зноў апынуліся ў холе "Праўды". Пацягнуліся цяжкія хвіліны, а потым і гадзіны чаканьня, а надзея своечасова патрапіць ў аэрапорт рабілася ўсё больш эфэмэрнай. Не распранаючыся, бавілі трывожную ноч на канапах і ў крэслах. Прахопліваліся ад перастрэлкі дзесьці на моры, напружана ўслухоўваліся ў адказы дзяжурных на тэлефонныя званкі. Раніцою ўстанавілі сваё пагадзіннае дзяжурства, па чарзе сталі хадзіць на сьняданак і на пляж, каб асьвяжыцца пасьля бяссоннае ночы. Марна спрабавалі дазваніцца ў Менск з кабінэта Пілії, затое ўведалі, што Даўлет Канстанцінавіч — каардынатар канфэдэрацыі горскіх народаў.

Не адразу ўсьвядомілі сувязь паміж караблём на рэйдзе і калёнаю вайсковых грузавікоў, якая рушыла каля дванаццаці дня ў бок Гагры. Але калі з пляжу насупраць шыкоўнага пансіянату "Самшитовая роща", узьведзенага турэцкімі будаўнікамі для колішняга ўсесаюзнага КГБ, узьвілася ракета, і карабель пайшоў туды, мы зразумелі: "Гэта ж наш карабель! Карабель, якога чакалі ўсю ноч!"

Калі мы пад’ехалі на "праўдзінскім "ПАЗіку", на карабель, што прычаліў проста да берагу, пасьпелі пагрузіцца вайскоўцы. Нас не зьдзівілі маракі з "калашнікавымі" і ў бронекамізэльках, празь якія выдавалі тоўстымі і няўклюднымі. Зьдзівіла, што менавіта наш дырэктар найперш садзіць разам з Саідам сваякоў ці знаёмых. Калі ўбачыў нас, дык зьбянтэжыўся, але ненадоўга, адразу стаў адгаворваць ехаць. Маўляў, гэты транспарт ідзе ў Наварасійск, а ўвечары прыйдзе іншы і з камфортам адвязе нас ў Сочы. Аднак пасьля нядоўгіх ваганьняў сышлі мы ў трум. Ужо пасьля таго, як падняўся адкідны мост і трум ператварыўся ў задушліва-цёмную апраметную, напоўненую дзіцячым плачам, пасьля таго, як пасажыры падняліся па адным праз вузкія люкі на палубу, пабачылі мы яшчэ адну "літфондаўскую" сям’ю. Расказалі яны, што пасьпелі толькі дзякуючы таму, што далі шалёныя грошы прыватніку, каб давёз да імправізаванага прычалу. Астатнія ўпрошвалі літфондаўскага шафёра, каб падкінуў іх з рэчамі на "ЛАЗе", але той адмовіў, сказаў, што ня мае на гэта дырэктарскага загаду. А можа, некаму зь іх трэба было менавіта ў Наварасійск?! Засталіся там між іншых Мікалай Пліско зь сямьёю, сям’я дачкі паэта Уладзіміра Огнева. Цяжка ўявіць, як яны разьбіраліся зь Пiліяй, калі даведаліся, што эвакуяваліся Дом творчасьці кінематаграфістаў, пансіянаты "Правда" і "Самшитовая роща", а таксама шмат жыхароў з навакольных вёсак.

Калі карабель ужо ніштавата адышоўся, у ваду проста з баку саскочыла трое мясцовых мужчын: праводзілі сваякоў дый затрымаліся ў труме. Паплылі яны да берагу ў адзеньні, трымаючы па-над вадою свае дакумэнты. А наш БДК-151 даволі хутка пашыбаваў з тэрытарыяльных водаў Грузіі і, мусіць, нездарма — праз колькі гадзін мы даведаліся, што пад Сухумі абстралялі "Комету", што ёсьць параненыя і нават забіты пасажыр. З палёгкаю ўздыхнулі,

калі мінулі Гагру і зьнік захутаны смугою ці то ад сьпёкі, ці то ад пажараў бераг.

Плысьці трэба было ня менш за пятнаццаць гадзін, а таму паступова пачалі ўладкоўвацца. Жанчыны зь дзецьмі занялі некаторыя матроскія і нават афіцэрскія каюты. Мужчыны разьмяшчаліся на палубах хто як мог. Адны на сваіх валізках і чамаданах, другія надзімалі матрацы, трэція ішлі да матросаў па іхнія паралёнавыя матрацы. Тыя з радасьцю саступалі іх за "дзякуй", за цыгарэты і за рублі. Як аказалася, карабель прыпісаны ў Еўпаторыі. Маракі атрымлівалі заробак ва ўкраінскіх купонах, на якія, калі і ўдавалася ступіць на бераг, нічога не маглі набыць ні ў расейскіх, ні ў грузінскіх портах.

Але якія дзіўныя людзі! Панікавалі на пасадцы, а праз паўгадзіны высыпалі на шканцы і з замілаваньнем назіралі за дробнай птушачкай і двума карабельнымі катамі. Дарослыя ня меней за дзяцей радаваліся чарадзе дэльфінаў. Але боцману было, мабыць, мала радасьці з пасажыраў, якія ад няма чаго рабіць соўгаліся па ўсім караблі, а хлопцаў ледзь не жывасілам трэба было адцягваць ад гарматы і кулямётаў. Дзівіліся мы з выразу твараў ягоных падначаленых. Прачытваліся на іх невыказная абыякавасьць і стома, як ад бясконцага недасыпаньня. Праўда, даволі арыгінальна мылі яны сваю форму — прывязвалі вяроўкамі на карме і скідалі пялёхацца проста ў бурапенны кільватэр.

Разгаварыўся я з адным вайскоўцам, старэйшым лейтэнантам. Той раіў дзякаваць богу, што нас вывезьлі. Ягоны прагноз быў самы змрочны: як толькі будуць выведзеныя з Абхазіі расейскія войскі (а найперш авіядэсантны полк), ператворыцца яна ў крывавы кацёл. Грузінская нацыянальная гвардыя атрымала ў спадчыну ад Закаўкаскай вайсковай акругі баявыя верталёты, артылерыю, танкі і іншую бронетэхніку, гранаты і безьліч стралковай зброі. А

што могуць супрацьпаставіць гэтаму так званыя апалчэнцы-інтэрнацыяналісты? Аўтаматы ды паляўнічыя стрэльбы? Апрача таго грузіны, якія нямала паваявалі пад Цхінвалам, намерваюцца прызваць у войска і вэтэранаў, што маюць досьвед баёў з маджахедамі. Хаця, з другога боку Аўганістан паказаў, што немагчыма выйграць вайну з партызанамі ў гарах. Асяціны паўцякалі з Грузіі ў Паўночную Асецію, а абхазам проста няма куды бегчы. Але і пра свой далейшы лёс ня мог нічога сказаць той старэйшы лейтэнант. Ня ведаў ён, ні ў якім гарнізоне служыцьме, ні дзе паселіць сям’ю...

Уначы мы нарэшце дасягнулі Наварасійска. Наіўна спадзяваліся, што неўзабаве ступім на бераг. Толькі а восьмай раніцы пайшоў да начальніка порту запыт пра катэры, каб высадзіць нас. Чакалі. Гадзіну, дзьве, тры... Дванаццаць! Так, толькі праз дванаццаць гадзін як сталі на рэйдзе, вызвалілі для нас прычал. А адна з прычын на тое — каб пасьпела пад’ехаць здымачная брыгада з тэлепраграмы "Вести"! Пяцьсот чалавек чакалі, каб апэратар мог зьняць момант, як намесьнік галавы гарадзкой адміністрацыі сустракае ўцекачоў і клапоціцца пра іх!

А як нас сустракалі! Столькі міліцыі я даўнавата ўжо ня бачыў. Наладзілі анкетаваньне, праверку дакумэнтаў, памежны і мытны дагляд ня горш як на сапраўднай мяжы. Большасьць з пасажыраў вярталася з адпачынку, везьлі дзяцей у школы, але былі сярод нас і ўцекачы. Расея прапаноўвала ім жыхарства і працу ў некалькіх рэгіёнах. А мы заганарыліся, як пачулі, што ўрад Беларусі запрасіў вярнуцца на радзіму, дакляраваў падтрымку ўсім суайчыньнікам — уцекачам з Абхазіі. З падобнай заявай ня выступіла больш ніводная з краінаў СНДз.

Намесьнік галавы гарадзкой адміністрацыі (па ўсім было відаць — былы партфункцыянэр) перад аб’ектывам тэлекамэры патэтычна паабяцаў усялякую

дапамогу і спрыяньне. Тых, хто сьпяшаўся трапіць на чыгуначны ці аўтавакзал, павывозілі аўтобусамі. А тых, хто хацеў бы патрапіць у Сочы, папрасілі яшчэ крыху пачакаць, паабяцаўшы задарма пакарміць, пасяліць у прыстойным інтэрнаце дый (зноў жа задарма!) адвезьці раніцай на "Ікарусах" у Адлерскі аэрапорт. Галодныя, зноў паселі мы чакаць пры высозных гурбах цэмэнту, які грузілі на ганконгаўскі сухагруз "Exemplar". Мімаволі параўноўвалі нашых вайскоўцаў і маракоў, што стаялі на палубе, з кітайскімі грузчыкамі. І параўнаньне тое было на карысьць апошніх. Сытыя і задаволеныя, зьдзекліва пазіралі яны ў наш бок, рагаталі, елі кавуны дый палілі дарагія цыгаркі. Жанчыны нашы першыя ня вытрымалі— паслалі міліцыянтаў у Абхазію і, парушаючы памежныя парадкі, пайшлі ў партовы буфет. Панакуплялі малака, ліманаду, памідораў, вэнджаных курэй, кілбасы і ня толькі накармілі дзяцей, але і падзяліліся з маракамі. Ім зноў належала ісьці ў паход, зноў рызыкаваць васямнаццаці-, дваццацігадовымі жыцьцямі.

Падняўся ў нас настрой, калі пачулі, што транспарт "Даурия" вывез з Піцунды ў Сочы астатніх адпачыньнікаў. Нам жа дапяць туды было цяжэй. Тым болей, што словы пра дармовы праезд, харчаваньне і прыстойны інтэрнат аказаліся наскрозь хлусьлівымі, сказанымі для тэлекамэры. Абураныя, людзі выштурхалі са сталоўкі апэратара: павінен жа ён быў спытаць дазволу здымаць людзей, не пазбаўляць іх права спакойна паесьці за ўласныя грошы?

Але на эвакуацыйным пункце нам пашанцавала: сустрэлі земляка, падпалкоўніка Алега Уладзіміравіча Шчэрбу, які нарадзіўся ў вёсцы Мёчча, што на Барысаўшчыне. Ён сказаў, што аэрапорт у Адлеры перагружаны, вылецець будзе няпроста, а таму зрабіў нам патрэбныя даведкі і параіў ехаць цягніком. Больш за тое — адвёз на "Ніве" на вакзал. Калі разьвітваліся, дык

паўжартам запрасілі яго служыць у беларускае войска. А ён сур’ёзна і па-беларуску запэўніў, што гатовы, хай толькі радзіма пакліча.

Трыццаць шэсьць гадзін у перанаселеным пляцкартным вагоне цягніка "Наварасійск — Рыга" — гэта, вядома, ня цукар. Але калі згадаў я ў ім падпалкоўніка Шчэрбу, падумалася: "Дай, божа, паболей такіх афіцэраў у беларускае войска! І ня дай, божа, каб давялося працаваць яму яшчэ ў якім бы там ні было эвакуацыйным камітэце! Дай, божа, каб ніколі і нікому не ўдалося разьвязаць на нашай зямлі такога канфлікту!"

Вось такі, браце, надарыўся адпачынак.

Покуль разьвітваюся. Пішы часьцей са свайго Нью-Дэлі!

Піцунда—Наварасійск—Менск,
жнівень-верасень 1992

KAMUNIKAT.org